## «ЛіМ»-акцэнты

**Вернісаж.** Урачыстае адкрыццё выставачнага праекта «Кнігі ў дар Прэзідэнту» адбылося ў галерэі «Атрыум» Нацыянальнай бібліятэкі. Упершыню на адной пляцоўцы шырокай публіцы дэманструецца калекцыя кніг, падораных Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку кіраўнікамі дзяржаў блізкага і далёкага замежжа, дзяржаўнымі і культурнымі дзеячамі розных краін. Урачыста адкрылі выстаўку першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Пяткевіч, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар Карпенка і генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім Гігін. У экспазіцыі прадстаўлена больш за 50 выданняў са збору Палаца Незалежнасці, Прэзідэнцкай бібліятэкі і НББ — рэдкія кнігі XVIII—XIX стагоддзяў, а таксама сучасныя выданні рознай тэматыкі. Бібліяграфічную каштоўнасць і ўнікальнасць ім надаюць пакінутыя аўтографы і дароўныя надпісы, арыгінальныя пераплёты і г. д. Выстаўка будзе працаваць да 12 студзеня 2025 года.

**Форум.** І Форум блогераў Беларусі «БлогБай. Нам ёсць што сказаць!» збірае больш за 150 прадстаўнікоў блогерскай супольнасці з усёй краіны, гаворыцца на сайце Міністэрства інфармацыі. Мерапрыемства ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку пачнецца сёння і завершыцца заўтра. У праграме — тэарэтычныя і практычныя заняткі, наведванне знакавых месцаў і пляцовак сталіцы, нефармальныя зносіны з экспертамі медыйнай супольнасці, журналістамі і кіраўнікамі СМІ, прэзентацыя дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі Беларусі. Арганізатар І Форуму блогераў — Міністэрства інфармацыі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і РУП «Белтэлекам».

**Праект.** 2 кастрычніка ў Нацыянальным гістарычным музеі адбудзецца адкрыццё выстаўкі аднаго прадмета, прысвечанай 100-годдзю заснавання першай беларускай узнагароды — ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга. Мерапрыемства запланавана ў рамках праекта «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры». Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР быў заснаваны 1 верасня 1924 года пастановай ЦВК і СНК БССР. Распрацоўкай праекта ўзнагароды займаўся мастак Генадзь Змудзінскі. Усяго было выраблена 300 ордэнаў, узнагароджанняў жа, паводле няпоўных звестак, было 169. Пасля заснавання агульнасаюзнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга ўручэнне ордэнаў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі было спынена ў 1933 годзе. На выстаўцы будзе прадстаўлены ордэн № 159, якім узнагародзілі Лазара Грынвальд-Муху ў 1932 годзе за працу ў органах АДПУ.

● Выстаўка абраза «Нараджэнне Маці Божай» 1648—1650 гг. адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі. Яна прымеркавана да свята Нараджэння Прасвятой Багародзіцы і Прыснадзевы Марыі. Кампазіцыя «Нараджэнне Маці Божай» становіцца класічнай у помніках візантыйскага жывапісу X—XIII стст., нагадваюць у музеі. Прадстаўлены абраз дэманструе традыцыйны варыянт іканаграфіі. «У правай частцы кампазіцыі паказана Праведная Ганна ў чырвоным адзенні, якая сядзіць на ложы. Перад ёй стол з дарамі і пачастункамі, прынесенымі служанкамі. Злева, у аконным праёме вежы, — праведны Іаакім. У ніжняй частцы кампазіцыі змешчаны сцэны "Купанне немаўля Марыі", "Спавіванне немаўля Марыі" і "Ласканне бацькамі немаўля Марыі"», — расказваюць арганізатары. Выстаўка будзе працаваць да 6 кастрычніка. Куратар — Любоў Сысоева, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускага мастацтва НММ.

**Адукацыя.** Цыкл тэматычных кінaлекторыяў па беларускіх дакументальных фільмах прадстаўляюць у Музеі гісторыі беларускага кіно — філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея. Удзельнікаў чакаюць майстар-класы ад вопытных рэжысёраў, гутаркі з прадстаўнікамі здымачных груп, дыскусіі ды іншае. Першы тэматычны кінaлекторый «Увага, трэці званок...» прайшоў учора. На ім гледачы ўбачылі фільмы «Святлана Данілюк», «Прастора Яўгена Лысіка», «Ларыса Александроўская».

● Цэнтр беларускай драматургіі запрашае на лекцыю тэатразнаўцы Яўгеніі Бачылы «Беларускія рэжысёры: Барыс Луцэнка», якая пройдзе 2 кастрычніка. Барыс Луцэнка — рэжысёр, народны артыст Беларусі. «Распрацоўваючы тэму дабра і зла, ён імкнуўся стварыць той тэатр, які дапаможа чалавеку зразумець самога сябе — спавядальны тэатр. Цяпер шматлікія адкрыцці рэжысёра і пастановачныя прыёмы могуць здавацца звыклымі, але за імкненне да метафарычнага, а не бытавога тэатра Барыс Луцэнка доўгі час падвяргаўся крытыцы. На лекцыі вы даведаецеся, як ён працаваў з паэтычнай тэксту і як гэта паўплывала на развіццё беларускага тэатра», — расказваюць у Цэнтры беларускай драматургіі.

**Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ**

## у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

# Медалі Багдановіча — кітайскім перакладчыкам

**Прафесара Нанькайскага ўніверсітэта Гу Юя і прафесара Другога Пекінскага ўніверсітэта замежных моў Хань Сяае добра ведаюць у творчым асяроддзі беларускіх майстроў прыгожага пісьменства. Дзякуючы намаганням Хань Сяае ў Пекіне выдадзена калектыўная кніга твораў беларускіх паэтаў і празаікаў, прафесар таксама пераклаў на кітайскую мову «Тры талеры» Андрэя Федарэнкі, зборнік прозы і паэзіі Алеся Бадака.**

— Цяпер працую над перакладам калектыўнага зборніка прозы «Іголка ў квадраце», куды ўвайшлі апавяданні пісьменнікаў Беларусі, якія пішуць на рускай мове, — расказаў Хань Сяае. — Асаблівую асалоду атрымаў ад знаёмства з прозай Алега Ждана, Алены Паповай, Сяргея Трахімёнка, іншых аўтараў кніг, якая пабачыла свет у праекце Саюза пісьменнікаў Беларусі і выдавецтва «Аверсэв» — «Сучасная беларуская літаратура». Ведаю, што ўсяго ў серыі выйшла ўжо дзесяць тамоў. Некаторыя з іх ёсць у бібліятэцы Цэнтра даследаванняў Беларусі Другога Пекінскага ўніверсітэта замежных моў.

Што да перакладчыка Гу Юя, то ім неверагодна шмат зроблена па прадстаўленні беларускай паэзіі на кітайскай мове. Найперш — паэзіі класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка, Максіма Багдановіча.

**Мікола БЕРЛЕЖ**

# Аб духоўнай велічы

**Літаратурны конкурс «Духоўная веліч» быў заснаваны ў 2018 годзе Брэсцкім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі, галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама сумесна з Брэсцкай і Пінскай епархіямі і Беларускім фондам міру.**

На конкурс прымаюцца творы ў намінацыях «Паэзія», «Мастацкая проза», «Публіцыстыка», «Літаратура для дзяцей». У творчым спаборніцтве ўдзельнічаюць аўтары, якія пражываюць на Брэстчыне і дасягнулі 18 гадоў. Адборачная камісія прымае літаратурныя творы любых жанравых і кампазіцыйных асаблівасцей (раман, аповесць, п'еса, зборнік апавяданняў, эсэ, вершаў, казак або мастацкай публіцыстыкі) на рускай і беларускай мовах.

Творы могуць быць прадстаўлены асобнымі кнігамі альбо публікацыямі ў рэспубліканскіх і замежных літаратурных перыядычных выданнях, якія пабачылі свет на працягу пяці гадоў да часу абвяшчэння творчага спаборніцтва.

Конкурсныя работы (два асобнікі выдання і заяўка з асабістымі звесткамі) прымаюцца да 1 кастрычніка 2024 года. Работы неабходна дасылаць на адрас: 224013, г. Брэст, праспект Машэрава, 75/1, каб. 605. Дасланыя творы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

**Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ**

## фестывалі

# Сустрэчы ў Завоссі

**Штогод на радзіме Адама Міцкевіча ладзіцца літаратурна-музычны фестываль «Восень у Завоссі». Гэты год не стаў выключэннем. 21 верасня ў Музеі-сядзібу Міцкевічаў «Завоссе» зноў з'ехаліся госці з Баранавіцкай зямлі і суседніх раёнаў, а таксама жыхары Мінска, Брэста, Гродна і іншых гарадоў.**



Надзвычай цікавай, насычанай і разнастайнай атрымалася сёлетняя праграма фестывалю. Арганізатары — Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Баранавіцкі райвыканкам — запрасілі да ўдзелу таленавітых людзей і калектываў, стварылі для наведвальнікаў дзясяткі пунктаў самых розных актыўнасцей.

Урачыстае адкрыццё адбылося з удзелам намесніка старшыні Баранавіцкага райвыканкама Міхаіла Барысевіча, дырэктара Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Сяргея Усіка, а таксама замежнага госця — дырэктара Дзяржаўнага музея-запаведніка «Астаф'ева» — «Рускі Парнас» (г. Масква) Юрыя Яўцюхіна.

Пасля падвядзення вынікаў конкурсу «Там пакінуў я душы часцінку…» на сцэне разгарнулася літаратурна-музычная праграма. Гучала шмат прыгожых і меладычных песень пра Беларусь у выкананні творчых калектываў Баранавіцкага раёна, чыталі свае вершы вядомыя і пачынаючыя паэты. Маладая публіка горача вітала на сцэне беларускага музыканта і блогера Ілью Шынкарэнку. Яркім гучаннем народных і аўтарскіх песень уразіў гледачоў народны фальклорны ансамбль «Сарматы».

Наведвальнікі атрымлівалі асалоду ад непаўторнай музычна-спеўнай спадчыны Міцкевічавай пары. Шмат гледачоў сабрала музычная праграма «Легенда Пана Тадэвуша» ў выкананні Святлены Немагай, Галіны Сакольнік і Таісіі Халамавай. Многіх прывабілі спевы Аляксея Жбанава і медытатыўнае гучанне музычных інструментаў капэлі Алеся Лася. У выкананні спявачак Студэнцкага этнаграфічнага таварыства прагучала праграма «Хадзіў раёк».

У сядзібным доме можна было паўдзельнічаць у цікавых гутарках, прысвечаных Адаму Міцкевічу.

Сярод аматараў відовішчаў была папулярная пляцоўка гістарычнай анімацыі. Дарослыя і малыя з захапленнем назіралі за шабельнымі баямі «феадалаў», самі вучыліся валодаць мячом, знаёміліся са шляхецкімі гульнямі і слухалі расповеды пра штодзённае жыццё нашых продкаў.

На «Бібліятэчным падворку», арганізаваным Баранавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкай імя Яна Чачота, частавалі духмянай гарбатай і забаўлялі гульнямі, квестамі, інтэрактывамі. На імправізаванай сцэне выступалі паэтычныя клубы і літаб'яднанні Баранавіцкага, Ляхавіцкага, Пінскага, Лунінецкага, Ганцавіцкага раёнаў, спявалі народныя вакальныя ансамблі.

Падчас свята праводзіліся экскурсіі, квесты і квізы па асноўнай экспазіцыі музея. Сваю пляцоўку з фотазонай і майстар-класамі прэзентаваў Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку. Адной з цікавостак свята стала літаратурна-дакументальная выстаўка «Пушкін, Вяземскі і Міцкевіч на "Рускім Парнасе"», прадстаўленая Дзяржаўным музеем-запаведнікам «Астаф'ева» — «Рускі Парнас».

На творчых майстар-класах можна было павучыцца старадаўнім танцам, зрабіць памятную манету, казачную птушку, сувенірны магніт або веер.

**Алена СЯМАШКА,
фота аўтара**

## між іншым

# Ляцелі песні над пушчай

**Турыстычнае свята «Роў аленяў» і фестываль бардаўскай песні і паэзіі «Музыка восені» трэці раз прайшлі ў Белавежскай пушчы.**

Выканаўцы песень пад гітару з Мінска, Брэста, Камянца і аграгарадка Дзмітравічы Камянецкага раёна спявалі ўсім вядомыя аўтарскія песні. Некаторыя барды дзяліліся з прысутнымі сваёй паэтычнай творчасцю. Лірычныя вершы чыталі таксама члены літаратурнага клуба «ПаэтыКо», які дзейнічае ў Кобрыне пры Брэсцкім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Кіраўнік клуба Наталля Ніжнік (Кандрашук) адкрыла фестываль сваім вершам «Залістападзілася…».

Уразіла выступленне самага юнага ўдзельніка фестывалю Міхаіла Карайчанцава з Мінска. Літаральна з першых гітарных акордаў і песенных радкоў 15-гадовы бард зачараваў усіх прысутных. Прыгожы голас Алесі Салаўёвай таксама не пакінуў слухачоў абыякавымі. Брастаўчанін Аляксей Дзямчук прыцягнуў увагу слухачоў песняй пра Брэсцкую крэпасць.

**Ніна ПЯТРОЎСКАЯ**